*Дзіяна Баброўская*

# СІМВОЛІКА БЫКА І ВАЛА Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Нашы продкі асэнсоўвалі сябе ў непарыўнай сувязі з навакольным светам - касмаганічным, прадметна-рэчыўным, раслінным і жывёльным. Жывёлагадоўля, як адна з галоўных форм жыццезабеспячэння, складала асаблівую сферу традыцыйнай культуры беларускага народа, насычаную міфалагічнымі ўяўленнямі, рытуальнымі дзеяннямі і прыкметамі, свой пачатак з глыбінь каменнага веку. Гэты культ пакінуў свае сведчанні і сярод археалагічны

Культ жывёлы вядомы ў многіх народаў свету і яго адгалоскі захаваліся да нашых дзён. Ён вядзе х знаходак. Так, на мілаградскіх гарадзішчах Паўднёвай Беларусі знойдзена больш за 100 фігурак жывёл, асабліва іх шмат (каля 90) было на гарадзішчы каля в. Гарошкаў Рэчыцкага раёна [1, с. 54]. У традыцыйнай культуры вобразы жывёл служаць адным са сродкаў выражэння ўяўленняў аб свеце ў разнабаковых яго праявах. Найбольш ярка яны адлюстроўваюцца ў такіх элементах духоўнай культуры, як павер'і і прыкметы, якія ахопліваюць розныя сферы жыцця і віды дзейнасці чалавека. Традыцыйныя народныя ўяўленні выступаюць у якасці матывацыі забарон, абярэгаў і рытуальна-магічных дзеянняў, аднак іх першапачатковы міфалагічны сэнс нярэдка змяняецца. Вялікай напоўненасцю міфапаэтычнай семанткі характарызуюцца ў традыцыйнай культуры вобразы быка і вала.

Бык - адна са старажытных жывёл, прыручаных чалавекам. У народнай традыцыі бык - вельмі шануемая жывёла, увасабленне сілы. Вол - кастрыраваны самец буйнай рагатай скаціны, выкарыстоўваецца як працоўная жывёла. Перавагі выкарыстання вала над быком у сельскай гаспадарцы складаюцца ў тым, што валы не выпрабоўваюць цягі да самак, паводзяць сябе нашмат спакайней і іх паводзіны больш кантраляваны. Калі вол атаясамліваецца з быком, ён сімвалізуе сонечны пачатак і пладавітасць. Калі ж ён разумеецца як кастрыраваны бык, то губляе значэнне пладавітасці і становіцца месяцовым знакам, увасабляючы прыроджаную фізічную сілу, цярплівую працу, дабрабыт і ахвярапрынашэнне.

У хрысціянстве бык увасабляе цярпенне, сілу, Хрыста як ахвяру, і з'яўляецца атрыбутам евангеліста св. Лукі, які падкрэслівае ахвярны аспект жыцця Хрыста. Прынята лічыць, што валы на выявах, якія паказваюць Ражство Хрыстова, сімвалізуюць язычнікаў і габрэяў [3, с. 214].

У працэсе развіцця міфалагічнай свядомасці і назапашвання працоўна-гаспадарчага вопыту адбылося істотнае развіццё міфалагічных вобразаў быка і вала, што дало магчымасць для ўзнікнення вялікай колькасці міфаў, легендаў, павер'яў, казак, загадак, замоў і інш. Так, акрамя агульнабеларускіх назваў, бык і вол, існуюць іх наступныя рэгіянальныя назвы: бык - *бычуга, бугай, бuяк, бабун, бычок-трацячок,* або *падцёлак* вол - *вапячына, валух, кастрак, байкун* (вол, якога запрагаюць у ярмо-адзіночку), *красей* (вол, чырвонай масці). [4, с. 21-25]; [1, с. 230].

Бык у славян з'яўляўся традыцыйнай ахвяравальнай жывёлай, уяўленні пра яго суадносіліся з паняццем святасці і рэлігійнага абраду [8, с. 130]. Цікавымі ў гэтым ракурсе зяўляюцца звесткі Пракопія Кесарыйскага(УІ ст.): «славяне лічаць, што адзін толькі бог, творца маланак, зяўляецца валадаром над ўсім, і яму прыносяць у ахвяру быкоў і здзяйсняюць іншыя свяшчэнныя абрады» цыт. па: [1, с. 54]. Вядомы шэраг святкаваняў, якія прадугледжвалі ахвяраванне быка ці іншыя рытуальныя дзеянні звязаныя з ім. Ва ўсходніх славян гэта Ільін дзень, Мікольшчына, у паўднёвых (у асноўным у балгараў і македонцаў) - дзень Праскевы Пятніцы. На тэрыторыі Беларусі культ быка прасочваецца ад часоў позднягa неаліту [1, с. 54]. У Польшчы бык з'яўляецца галоўнай асобай на Траецкія святкі. Яго пакрывалі старой сеткай, упрыгожвалі галінкамі і кветкамі, на рогі вешалі вянок, сплецены з галінак бярозы. Потым быка гналі уперад стада і садзілі на яго пудзіла воіна з ольховой кары, а затым скідывалі яго на зямлю. Гэты абрад называецца валовым вяселлем. Вобраз быка падчас суаносілі з Перуном або Ярылам (адзін з эпітэтаў Ярылы - *Яр-Тур* (адна з сакралізаваных жывёлін у міфалогіі) [8, с. 134], у вобразе чалавека-быка ўяўляўся славянскі Вялее. А. М. Афанасьеў абгрунтоўваў сувязь тура з Перуном на падставе загадак: *«Тур ходзіць па гарах, турыца па дачах; тур то свісне, турыца то мігне»* (гром і маланка). Вядома беларуская загадка: *«Чорны вол раве на сто гор»* (гром,) [1. с. 54]. Цёмная навальнічная хмара магла асацыявацца з турам, для якога была характэрна чорная афарбоўка з белай палосай уздоўж спіны.

Славяне верылі, што бык непадуладзен нячыстай сіле - разам з ваўком і мядзведзем. Але ж з іншага боку, нячысцік сам мог паявіцца ў абліччы быка. У розных славянскіх рэгіёнах вядома гульня ў быка, калі пераапрануты ў быка хлопец, забягаў у хату і пачынаў бадаць дзяўчат, прычым стараючыся як мага больш балюча. Потым нехта з прысутных «забіваў» быка. [7, с. 132]. У беларускім асяроддзі быку (радзей валу) надаецца выразная мужыцкая сімволіка, шлюбная, любоўная, сімоліка плоднасці.

Праз вобраз быка і вала ў беларускім фальклоры перадаюцца найперш уяўленні пра матэрыяльнае становішча і стан гаспадаркі беларуса: *«Сем сёл, адзін вол і той гол»; «На ўсё сяло адзін вол. і той гол»; «Жыве, як вол на бровары: ёсць, што есці. ёсць, што піць»; «Ват не равуць, авечкі не бляюць, калі ў яслях сена».* Вол ва ўяўленнях беларусаў, дзякуючы яго рэальным якасцям, як фізічная моц, вынослівасць і пакорлівасць, успрымаўся як асноўная цяглавая сіла *«Добрага вала не выпусцяць з сяла»; «Родам бык рагаты. але яго паганяюць»* менавіта гэта знайшло адбітак ў яго назве *цягло* [4, с. 25]. У беларускім фальклоры прасочваюцца загадкі пра быка як сімвала надыходу новага дня, што мае непасрэдную связь з узыходам сонца: *«Сівы бык у акенца шмык»* (світанне); *«Прыйшла чорня карова, усіх людзей папарола; прыйшоў белы бык, пад акно нік, усе людзі і паўставалі»* (ноч і дзень).

У Беларусі захаваліся ўяўленні пра чорнага вала, які сімвалізаў цяжкія жыццёвы выпрабаванні, беды, пакуты: Ек наступіць чорны вол на нагу, то знацьме ўсё (Кас, 268). У Заходняй Беларусі гаспадар не пачынаў араць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чорным валом, каб на полі збожжа не загінула ад дажджоў [7, с. 409], аднак на чорных валах-блізнятах абворвалі вёску, каб засцерагчы яе ад граду [5, с. 76].

Як бачым, што нават добра знаёмая любому сучаснаму чалавеку жывёліна ў міфічных уяўленнях беларускіх сялян, адзначаецца складанай і значнай, па аб'ёме, сістэмай уяўленняў, дзе прысутнічаюць і станоўчыя і негатыўныя адзнакі, значная і на першы погляд супярэчлівая семантыка. Доўгае суіснаванне чалавека з быком і валом стварыла вакол гэтых жывёлаў густую міфалагічна- магічную атмасферу. Вышэй прыведзеныя прыклады дазваляюць вылучыць некалькі аспектаў у сімволіцы названых жывёл: гэта уяўленне пра матэрыяльнае становішча і гаспадаку, жыццёвыя выпрабаванні, беды, пра уяўленне святасці і рэлігійнага абраду. вынікае што, бык мае выразную мужыцкую сімволіку, вол увасабляе сабой фізічную моц, пакорлівасць і вынослівасць.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. - Мінск, 2004.
2. Валодзіна, Т. Вобразы свойскіх жывёлаў у фразеалогіі і павер'ях беларусаў / Т.Валодзіна // Роднае слова. - 2003. - № 4. - С. 82-85.
3. Гура, А.В. Символика животных в славянской народной традиции / А.В. Гура. - М.: Индрик, 1997. - 910 с.
4. Жывёльны свет : тэматычны слоўнік / склад В.Дз. Астрэйка і інш. ; рэд. Л.П. Кунцэвіч, А.А. Крывіцкі. - Мінск, 1999.
5. Зямля стаіць пасярод свету: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Мн., 1996
6. Славянская мифология : энциклопедический словарь / под ред. Л.М. Анисова. - М„ 1995
7. Славянские древности: Этнолингвистический словарь. Т.1. М., 1995
8. Шапарова Н. С. Краткая энциклопедия славянской мифологии: около 1000 статей. М., 2001


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ